**А.І.Смолік,** *прафесар*

# ІНТЭГРАЦЫЯ ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ – ПРЫЯРЫТЭТНЫ КІРУНАК ДЗЕЙНАСЦІ КАФЕДРАЎ

Фарміраванне асноў прафесійнага майстэрства з'яўляецца важнейшай умовай эфектыўнага выканання сацыяльна-культурнымі інстытутамі сваіх грамадска значных функцый. Праблема падрыхтоўкі работнікаў устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый культуры знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі.

Глыбокае і ўсебаковае асэнсаванне ролі культуры ў трансфармацыйны перыяд сведчыць аб тым, што сацыяльна-культурная дзейнасць аб'ектыўна становіцца ўмовай удасканалення сацыяльнай рэчаіснасці, важнай формай самавыяўлення, самарэалізацыі асобы. Перамены ў змесце і арганізацыі сацыяльна-культурнай, адпачынкавай дзейнасці, якія распачаліся ў канцы XX ст., патрабавалі пераасэнсавання і карэкціроўкі дзейнасці навучальных устаноў па падрыхтоўцы работнікаў культуры і мастацтва.

У Беларусі сфарміравалася шматталіновая сістэма культуралагічнай і мастацкай адукацыі з трыма ўзроўнямі: пачатковым, сярэднім спецыяльным і вышэйшым. У 2003 г. у краіне налічвалася 507 школ мастацкай адукацыі, 21 музычная, харэаграфічная і культурна-асветная сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова і тры вышэйшыя навучальныя ўстановы (гл. табл.).

***Навучальныя ўстановы культуры і мастацтва**** 

| Тыпы ўстаноў | Колькасць | |
|---|---|---|
| | устаноў | студэнтаў і навучэнцаў |
| ВНУ | 3 | 6323 |
| ССНУ | 21 | 7255 |
| Школы | 509 | 91946 |
| Усяго | 533 | 105527 |

* Падлікі зроблены на падставе даных, змешчаных у кн.: Беларуская культура сёння. 2004: Гадавы агляд і статыстычны партрэт культуры Беларусі. – Мн., 2004.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Канцэпцыі развіцця вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь у новых умовах вызначаны два асноўныя кірункі падрыхтоўкі спецыялістаў для культурна-асветных устаноў: забеспячэнне галіны культуры, з аднаго боку, арганізатарамі самадзейнай мастацкай творчасці, а з другога – арганізатарамі правядзення вольнага часу і адпачынкавай дзейнасці насельніцтва [3]. Сутнасць праблемы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы заключаецца ў пераадоленні яскрава выражаных супярэчнасцей паміж велізарнай колькасцю сацыяльна значных задач, што ўзніклі ў адкрытым для правядзення вольнага часу асяроддзі посткатастрофнага соцыуму, і некампетэнтнасцю многіх работнікаў у іх вырашэнні.

У працэсе рэформы вышэйшай школы беларускія вышэйшыя навучальныя ўстановы культуры і мастацтва імкнуцца пераадолець існуючыя супярэчнасці паміж аб'ектыўнымі патрэбамі сучаснай сацыяльна-культурнай сферы ў прынцыпова новым тыпе спецыяліста і адсутнасцю навучальных устаноў, якія б забяспечвалі падрыхтоўку такога спецыяліста. У гэты перыяд у краіне адбылося пераўтварэнне ранейшых інстытутаў ва універсітэты, што дазволіла распачаць падрыхтоўку па шэрагу новых спецыяльнасцей. Так, у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў у гэты час было ўведзена 13 новых спецыялізацый, сярод якіх менеджмент сацыяльна-культурнай сферы, арганізацыя сацыякультурнай дзейнасці, рэжысура масавых відовішчаў і свят, рэстаўрацыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фальклорнае мастацтва, карпаратыўнае мастацтва, духавыя народныя інструменты, народныя спевы, сусветная і айчынная мастацкая культура, сацыяльна-псіхалагічная рэабілітацыя сродкамі мастацтва і інш. Новыя спецыялізацыі ўводзіліся ў Беларускай акадэміі музыкі і Беларускай акадэміі мастацтваў. Адначасова вышэйшыя навучальныя ўстановы актыўна займаліся абнаўленнем зместу навучання. Як паказалі нашы даследаванні, да рэформы вышэйшай школы агульнанавуковыя, агульнаадукацыйныя і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыяльныя прадметы былі ізаляванымі, узаемна не звязанымі, выкладаліся ў розных планах, з розных метадычных пазіцый і падыходаў. Паміж імі адсутнічала пераемнасць на ўсіх ступенях навучання. Гэта прыводзіла да таго, што студэнты ўспрымалі кожную дысцыпліну адасоблена. У выніку яны адчувалі значныя цяжкасці ў практычным выкарыстанні атрыманых ведаў. Галоўная супярэчнасць вышэйшай мастацкай адукацыі заключалася ў неадпаведнасці паміж працэсам раздзельнага засваення ведаў і неабходнасцю комплекснага іх выкарыстання ва ўмовах практычнай дзейнасці. Таму неабходна было распрацаваць мадэль тэхналогіі цэласнай педагагічнай дзейнасці, згодна з якой навучэнцы авалодвалі б ведамі, уменнямі, навыкамі, патрэбнымі спецыялісту, а таксама звярталася іх увага на канкрэтныя прафесійныя праблемы, што ім давядзецца вырашаць.

У святле агульнай метадалогіі сістэмнага падыходу прафесійная падрыхтоўка работнікаў сацыяльна-культурнай сферы разглядаецца як педагагічная сістэма высокай складанасці, сукупнасць элементаў, якія ўтвараюць пэўную цэласнасць, адзінства. Паняцце цэласнасці адносна фарміравання асобы спецыяліста азначае ўнутранае адзінства агульнай і прафесійнай яго падрыхтоўкі пры адноснай самастойнасці і незалежнасці асобы ад сацыяльна-культурнага асяроддзя, адзінства ўсіх напрамкаў выхавання, усёй разнастайнасці формаў, сродкаў і ўмоў.

Вырашэнне гэтых задач у многім залежыць ад рэалізацыі прынцыпаў бесперапыннасці і пераемнасці працэсу адукацыі. Перспектыўным кірункам шматузроўневай сістэмы адукацыі, якая забяспечвае бесперапынную адукацыю, з'яўляецца інтэграцыя сярэдняй спецыяльнай адукацыі з вышэйшай.

БДУ культуры і мастацтваў на працягу некалькіх гадоў у парадку эксперыменту праводзіць работу па інтэграцыі вучэбных планаў і праграм ССНУ і ВНУ. На базе Гродзенскага, Мінскага каледжаў мастацтва, Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гімназіі-каледж №24 г.Мінска створаны комплексы "каледж – ВНУ", дзе завершаны працэс аб'яднання сярэдняй спецыяльнай адукацыі з вышэйшай. Справа ў тым, што эфектыўнасць навучання ў ВНУ залежыць ад наяўнасці ў студэнтаў высокага ўзроўню матывацыі выбару прафесіі, арыентаванасці ў адносінах будучай спецыяльнасці. Фарміраванне гэтых якасцей павінна ажыццяўляцца на этапе да паступлення ў ВНУ. Вопыт сведчыць: пераемнасць мастацкай прафесійнай адукацыі найбольш эфектыўна адбываецца ў перыяд навучання ў ССНУ. На гэтым этапе магчыма збалансаваць вучэбныя планы і праграмы, у рабочыя планы сярэдніх спецыяльных установ уключыць набор сацыяльна-гуманітарных і спецыяльных дысцыплін, якія вывучаюцца на 1–2 курсах ВНУ культуры і мастацтваў. У межах эксперыменту створаны такія скразныя вучэбныя планы па спецыяльнасцях "народная творчасць", "рэжысура", "харэаграфічнае мастацтва", "бібліятэказнаўства і бібліяграфія". Змест планаў арыентаваны на далейшае навучанне выпускнікоў ССНУ ва універсітэце са скарочаным тэрмінам. Улічваючы, што ва ўмовах скарочанага тэрміну навучання вучэбная нагрузка студэнта ўзрастае, выкладчыкі ССНУ ўнеслі пэўныя змяненні ў навучальны працэс. У каледжах узмоцнена тэарэтычная падрыхтоўка ў галіне культуралагічных і мастацтвазнаўчых дысцыплін, павялічаны аб'ём самастойнай работы, зроблены акцэнт на выпрацоўку ў навучэнцаў уменняў і навыкаў рацыянальнай арганізацыі вучэбнай дзейнасці, развіццё творчых здольнасцей.

Бесперапыннасць і поліфункцыянальнасць мадэлі "каледж – ВНУ" вызначаюцца тым, што ў яе рамках функцыянуюць завершаныя адукацыйныя цыклы, якія забяспечваюць навучэнцам магчымасць карэкцыі ў працэсе навучання сваёй адукацыйнай траекторыі. У кожнага ўзроўню – пэўныя мэты і задачы ў сістэме бесперапыннай адукацыі: ад праграмы сярдэняй спецыяльнай адукацыі да праграмы вышэйшай прафесійнай адукацыі. Такая мадэль, па нашым меркаванні, фарміруе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыйнае асяроддзе, адкрытае і гнуткае з пункту гледжання як навучэнца, так і выкладчыка.

Адным з важнейшых умоў функцыянавання ССНУ у рамках разглядаемага комплексу з'яўляецца, з аднаго боку, завершанасць кожнай ступені навучання, а з другога – навучэнцы маюць магчымасці працягваць адукацыю на наступных ступенях. Неабходна таксама адзначыць і захаванне магчымасці атрымаць дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што дае выпускніку ССНУ поўную свабоду далейшага выбару. Штогод 34 выпускнікі комплексу пасля дзяржаўных экзаменаў па рэкамендацыі педсаветаў сярэдніх спецыяльных устаноў залічваюцца адразу на другі або трэці курс БДУ культуры і мастацтваў. Значная частка іх пасля заканчэння універсітэта працягвае навучанне ў магістратуры і аспірантуры.

Змест кожнай ступені навучання вызначаецца зыходзячы з прынцыпаў бесперапыннай адукацыі і патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да комплексу: інтэграцыя, узаемадапаўняльнасць вучэбных планаў і праграм, адукацыйных стандартаў, узамаабумоўленасць формаў і метадаў навучання ў ССНУ і ВНУ.

Важным кірункам сумеснай дзейнасці комплексу "каледж – ВНУ" з'яўляецца ўдасканаленне навукова-метадычнай работы, якая дазваляе павысіць кваліфікацыю выкладчыкаў ССНУ, а тым самым і якасць падрыхтоўкі будучых спецыялістаў сацыякультурнай сферы. Стала традыцыяй правядзенне прафесарамі і дацэнтамі універсітэта майстар-класаў, семінараў-практыкумаў, кансультацый, прэзентацый вучэбна-метадычнай літаратуры ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Штогод у рамках навукова-метадычнай канферэнцыі, якая ладзіцца універсітэтам, працуе секцыя "Праблемы інтэграцыі вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі".

Такім чынам, шматгадовое існаванне вучэбна-метадычнага комплексу "каледж – ВНУ" паказвае, што нарадзілася эфектыўная форма адукацыйнага працэсу, які грунтуецца на навукова-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэарэтычнай метадалогіі і інавацыйнай дынаміцы. У межах комплексу вырашаюцца тры важнейшыя задачы:

– забеспячэнне высокага ўзроўню інтэлектуальна-асобаснага і духоўнага развіцця навучэнцаў ССНУ і студэнтаў ВНУ;

– стварэнне ўмоў для авалодання выпускнікамі універсітэта інавацыямі, якія маюцца ў сацыякультурнай сферы;

– інтэграванне сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, якая дазваляе на высокім навуковым узроўні засвойваць веды, уменні і навыкі, неабходныя сучаснаму спецыялісту сферы культуры.

---

1. *Беларуская* культура сёння, 2004: Гадавы агляд і статыстычны партрэт культуры Беларусі. – Мн.: Бел. ін-т праблем культуры, 2004. – 349 с.

2. *Кларин М.В.* Инновации в мировой педагогике. Обучение на основе исследования, игры и дискуссии: анализ зарубежного опыта. – Рига: Пед. центр «Эксперимент», 1995. – 176 с.

3. *Концепция* национальной школы Беларуси // Фактары станаўлення і развіцця нацыянальнай школы Беларусі: Матэрыялы навук.-практ.канф. / Пад рэд. М.А.Гусакоўскага, А.І.Жука. – Мн.: Акад. паслядыплом. адукацыі, 1994. – С.104–155.

4. *Образование* в конце XX века: Материалы круглого стола / А.Ф.Зотов, В.И.Купцов, В.М.Розин и др. // Вопр. философии. – 1992. – №9. – С.3–21.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ